М. Яцэвіч



Да 65-годдзя з часу ўтварэння

# Вышэйшая бібліятэчная адукацыя ў Беларусі: традыцыі і навацыі

Сёлета вышэйшай бібліятэчнай адукацыі Беларусі спаўняецца 65 гадоў. Усё пачалося 29 ліпеня 1944 года, калі пастановай Савета народных камісараў БССР было прынята рашэнне аб стварэнні бібліятэчнага факультэта на базе тагачаснага Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. З кастрычніка гэтага года да заняткаў па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» прыступілі першыя 30 студэнтаў. Была створана кафедра бібліятэказнаўства. У наступныя гады факультэт змяняў сваю назву: факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, а з 2003 года – факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) БДУ культуры і мастацтваў.

Асноўныя гістарычныя вехі развіцця факультэта выкладзены ў публікацыях [1–5]. Спынімся на тых зменах, якія адбыліся ў вышэйшай бібліятэчнай адукацыі Беларусі за апошнія пяць гадоў.

Сёлета на ФІДК працуюць 6 кафедраў: тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, інфармацыйных рэсурсаў, менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, замежных моў, гісторыі Беларусі і музеязнаўства. Усе яны з'яўляюцца выпускаючымі па адпаведных спецыялізацыях. На кафедрах працуе каля 80-ці выкладчыкаў. Сярод кафедраў па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» – звыш 70 працэнтаў выкладчыкаў маюць вучоныя ступені і званні.

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»» з кваліфікацыяй «бібліятэкар-бібліёграф» ажыццяўляецца па наступных пяці напрамках спецыяльнасці: менеджмент, аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы (АБІС), інфармацыйнае забеспячэнне (па сферах дзейнасці), філалогія (беларуская мова і літаратура), лінгвістыка (англійская мова), кніжны гандаль. У залежнасці ад напрамку спецыяльнасці і спецыялізацыі выпускнікам прысвойваюцца адпаведныя дадатковыя да асноўнай кваліфікацыі: менеджэр, спецыяліст па АБІС, спецыяліст па інфармацыі, выкладчык, перакладчык, тавараназнаўца (кніжны гандаль). У межах напрамкаў спецыяльнасці студэнты навучаюцца па 9 спецыялізацыях.

У верасні 2009 г. па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» ва універсітэце навучаецца каля 1400 студэнтаў, з іх 675 – на дзённай форме навучання. План набору на I курс на бюджэтную дзённую форму навучання ў 2009 г. складаў 130 чалавек. Для параўнання: у 1994 г. – 63 чалавекі, у 1974 г. – 250 чалавек. На завочную бюджэтную форму навучання за апошнія пяць гадоў штогод у сярэднім прымаецца 100 чалавек. Колькасныя вынікі набору студэнтаў па гадах на вочную/завочную формы навучання (бюджэт/платнае навучанне) з 1997 па 2009 гг. прадстаўлены ў табл.1.

Патрэбы ў спецыялістах значна перавышаюць колькасць студэнтаў-выпускнікоў дзённай формы навучання. Апошнія тры гады на кожнага выпускніка па заяўках бібліятэк прыходзілася звыш двух працоўных месцаў. Такім чынам, каб задаволіць патрэбы краіны ў бібліятэкарах, набор на бюджэтную форму навучання трэба павялічыць прыкладна ў два разы. У сённяшніх эканамічных умовах гэта немагчыма. Акрамя таго, значнае павышэнне набору можа прывесці да зніжэння конкурсу пры паступленні, не садзейнічае залічэнню ва універсітэт лепшых абітурыентаў. Увогуле, сярэдні конкурс на дзённую форму навучання па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» за апошнія пяць гадоў і так зменшыўся: ад 2,5 да 1,5 чалавек на месца ў залежнасці ад спецыялізацыі. Патлумачыць гэта можна зніжэннем сацыяльнага статусу бібліятэчнай прафесіі, дэмаграфічнымі праблемамі, а таксама пэўнымі недапрацоўкамі ў прафарыентацыйнай рабоце з боку факультэта.

У апошнія пяць гадоў факультэт плённа працаваў над удасканаленнем сістэмы бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі Беларусі, якая складаецца з пяці ўзроўняў: сярэдняя спецыяльная адукацыя – вышэйшая адукацыя – магістратура – аспірантура (дактарантура) – павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў (гл. табл. 2). Усе гэтыя ўзроўні цесна ўзаемазвязаны,

*Табліца 1*

Набор студэнтаў па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» ў БДУ культуры і мастацтваў (1997–2009 гг.)

| Год | Дзённая форма навучання | | | Завочная форма навучання | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | бюджэтная | платная | усяго | бюджэтная | платная | |
| 1997 | 112 | 100 | 12 | 90 | 80 | 10 | 202 |
| 1998 | 111 | 102 | 9 | 83 | 80 | 3 | 194 |
| 1999 | 128 | 101 | 27 | 94 | 80 | 14 | 222 |
| 2000 | 122 | 101 | 21 | 101 | 80 | 21 | 223 |
| 2001 | 123 | 107 | 16 | 92 | 80 | 12 | 215 |
| 2002 | 132 | 117 | 15 | 96 | 80 | 16 | 228 |
| 2003 | 139 | 117 | 22 | 104 | 97 | 7 | 243 |
| 2004 | 136 | 119 | 17 | 173 | 97 | 76 | 309 |
| 2005 | 149 | 120 | 29 | 136 | 97 | 39 | 285 |
| 2006 | 143 | 114 | 29 | 136 | 97 | 39 | 279 |
| 2007 | 161 | 115 | 46 | 141 | 100 | 41 | 302 |
| 2008 | 168 | 115 | 53 | 134 | 101 | 34 | 302 |
| 2009 | 178 | 130 | 48 | 175 | 108 | 67 | 353 |

узаемадзейнічаюць паміж самой і на практыцы рэалізуюць прынцып пераймальнасці бібліятэчнай адукацыі.

Сярэдняя спецыяльная бібліятэчная адукацыя інтэгравана з вышэйшай. Выпускнікі Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа (МДБК) імя А.С. Пушкіна паступаюць у БДУ культуры і мастацтваў на скарочаную дзённую і завочную формы навучання (адпаведна тры і чатыры гады). Паміж універсітэтам і каледжам у 2009 г. заключана новая дамова аб вучэбным і навукова-метадычным супрацоўніцтве. З мэтай рэалізацыі пастановы Калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (снежань 2008 г.) у маі 2009 г. прынята рашэнне і заключана дамова аб адкрыцці на базе МДБК філіяла БДУ культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» па завочнай форме навучання. Плануецца ў 2010 г. аб'явіць набор студэнтаў у колькасці 25 чалавек. Адкрыццё філіяла будзе спрыяць больш рацыянальнай падрыхтоўцы і замацаванню на месцах бібліятэчных кадраў, у першую чаргу, для Магілёўскай і Гомельскай абласцей, якія менш за ўсіх у краіне забяспечаны спецыялістамі з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй. ФІДК і МДБК сумесна распрацавалі і зацвердзілі новую вучэбна-метадычную дакументацыю для навучання па сістэме «каледж – універсітэт»: вучэбныя планы вышэйшай адукацыі, інтэграваныя з сярэднеспецыяльнай; праграмы вучэбных дысцыплін, графікі вучэбнага працэсу, палажэнне аб групе з паглыбленым вывучэннем спецыяльных дысцыплін у каледжы і інш.

Значныя змены адбыліся на ўзроўні вышэйшай адукацыі на ФІДК. У 2008 г. зацверджаны новы адукацыйны стандарт па спецыяльнасці Е 1-23 01 11 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)»: вышэйшая адукацыя, першая ступень, тэрмін навучання – 4 гады, які ўжо пачаў укараняцца ў вучэбны працэс з 2008–2009 навучальнага года. Адукацыйны стандарт устанаўлівае мэты і задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста з кваліфікацыяй «бібліятэкар-бібліёграф», патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускніка па спецыяльнасці, патрабаванні да зместу адукацыйнай праграмы і яе рэалізацыі, патрабаванні да забеспячэння адукацыйнага працэсу і выніковай дзяржаўнай атэстацыі.

Адукацыйны стандарт прайшоў экспертызу на адпаведнасць першай ступені вышэйшай бібліятэчнай адукацыі Расіі і Германіі, а таксама ў Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі і Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

У аснову адукацыйнага стандарту ўпершыню пакладзены кампетэнтнасны падыход. Кампетэнтнасны падыход заключаецца ў авалоданні будучымі спецыялістамі кампетэнцыямі – ведамі, уменнямі і вопытам, якія неабходны для вырашэння тэарэтычных і практычных задач прафесійнай дзейнасці. У сваю чаргу, кампетэнтнасць – гэта выяўленая здольнасць выкарыстоўваць свае веды і ўменні ў працэсе практычнай дзейнасці (СТБ ІСО 9000). Кампетэнцыі задаюцца ў выглядзе своеасаблівых стандартаў і ўяўляюць сабой абагульненую якасць і нарматыўны элемент для будучых спецыялістаў.

У адпаведнасці са стандартам падрыхтоўка бібліятэчнага спецыяліста павінна забяспечваць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

- акадэмічных кампетэнцый, якія ўключаюць веды і ўменні па засвоеных дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца;
- сацыяльна-асобасных кампетэнцый, што ўключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне ідэалагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы і ўменне кіравацца імі;
- прафесійных кампетэнцый, якія ўключаюць веды і ўменні фармуляваць праблемы, вырашаць задачы, распрацоўваць планы і забяспечваць іх выкананне ў абранай сферы прафесійнай дзейнасці.

Прафесійныя кампетэнцыі «бібліятэкара-бібліёграфа», акрамя адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці, вызначаюцца таксама стандартам прадпрыемства (кваліфікацыйнай характарыстыкай) па напрамку спецыяльнасці і спецыялізацыі. У гэтых нарматыўных дакументах патрабаванні да прафесійных кампетэнцый, якімі павінен валодаць выпускнік, сфармуляваны па наступных відах бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці: вытворча-тэхналагічнай, сацыяльна-культурнай, навукова-метадычнай, навукова-даследчай, арганізацыйна-кіраўніцкай, педагагічнай, інавацыйнай.

Адукацыйная праграма падрыхтоўкі выпускніка прадугледжвае вывучэнне наступных цыклаў дысцыплін: сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўчых (уведзены ўпершыню), агульнапрафесійных і спецыяльных, спецыялізацыі. У стандарце прадстаўлена структура тыпавога вучэбнага плана, таксама рэгламентуюцца патрабаванні да абавязковага мінімуму зместу вучэбных праграм і кампетэнцый па дысцыплінах. Змест вучэбнай праграмы дысцыпліны па кожнаму цыклу прадстаўляецца ва ўзбуйненых дыдактычных адзінках

*Табліца 2*

Бесперапынная сістэма бібліятэчнай адукацыі Беларусі

| | Узроўні адукацыі | Кваліфікацыя спецыяліста |
|---|---|---|
| V | Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка (Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУ культуры і мастацтваў) | Бібліятэкар-бібліёграф |
| IV | Аспірантура (дактарантура) (БДУ культуры і мастацтваў) | Кандыдат (доктар) педагагічных (гістарычных, філалагічных, тэхнічных) навук |
| III | Вышэйшая адукацыя (другая ступень) Магістратура (БДУ культуры і мастацтваў) | Магістр педагагічных (гістарычных, тэхнічных, філалагічных) навук |
| II | Вышэйшая адукацыя (першая ступень) Спецыялісты (БДУ культуры і мастацтваў; ВДУ імя П.М. Машэрава, завочнае аддзяленне) | Бібліятэкар-бібліёграф<br>менеджэр<br>спецыяліст па АБІС<br>спецыяліст па інфармацыі<br>выкладчык (беларуская мова і літаратура)<br>перакладчык (англійская мова)<br>тавараазнаўца (кніжны гандаль ) |
| I | Сярэдняя спецыяльная адукацыя (МДБК імя А.С. Пушкіна; Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў, завочнае аддзяленне) | Бібліятэкар-бібліёграф |

(ці вучэбных модулях), а патрабаванні да кампетэнцый па дысцыпліне – у ведах і ўменнях.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта ўпершыню былі распрацаваны і зацверджаны ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь пяць тыпавых вучэбных планаў на кожны з вышэйназваных напрамкаў спецыяльнасці. У аснову распрацоўкі тыпавых вучэбных планаў былі пакладзены наступныя прынцыпы: арыентацыя на сучасную бібліятэчна-інфармацыйную практыку і інавацыйныя тэхналогіі, перaймальнасць з сярэднеспецыяльнай адукацыяй, інтэграванасць агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін (у выніку – змяншэнне іх колькасці), пашырэнне пераліку дысцыплін на выбар студэнта, павелічэнне колькасці гадзін на самастойную работу студэнта, паслядоўнасць праходжання вучэбных дысцыплін і відаў практык. У табл. 3 у якасці прыкладу прыведзены цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін тыпавога вучэбнага плана па напрамку спецыяльнасці «аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы».

*Табліца 3*

| 3 | Цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | усяго | аўдыторных |
| | ***Агульнапрафесійныя дысцыпліны*** | | |
| | *Абавязковы кампанент* | 1792 | 914 |
| 3.1 | Ахова працы | 24 | 18 |
| 3.2 | Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю | 48 | 36 |
| 3.3 | Культуралогія | 106 | 50 |
| 3.4 | Педагогіка і псіхалогія | 266 | 140 |
| 3.5 | Беларуская і сусветная літаратура | 440 | 230 |
| 3.6 | Тэорыя інфармацыі і дакументалогія | 404 | 200 |
| 3.7 | Бібліятэказнаўства | 264 | 120 |
| 3.8 | Бібліяграфазнаўства | 240 | 120 |
| 3.9 | *Кампанент ВНУ* | 510 | 270 |
| 3.10 | *Дысцыпліны і курсы на выбар студэнта* | 208 | 138 |
| | ***Спецыяльныя дысцыпліны*** | | |
| | *Абавязковы кампанент* | 1920 | 1000 |
| 3.11 | Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы | 200 | 110 |
| 3.12 | Інфармацыйныя рэсурсы | 738 | 410 |
| 3.13 | Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне | 316 | 150 |
| 3.14 | Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент | 342 | 180 |
| 3.15 | Алгарытмізацыя і асновы праграмавання | 178 | 92 |
| 3.16 | Базы даных | 212 | 100 |
| 3.17 | Праграмна-тэхнічнае забеспячэнне | 124 | 68 |
| 3.18 | Інфармацыйна-лінгвістычнае забеспячэнне | 170 | 100 |
| 3.19 | Электронныя бібліятэкі | 112 | 50 |
| 3.20 | Бібліятэчныя камп'ютэрныя сеткі | 168 | 100 |
| 3.21 | Праектаванне АБІС | 80 | 40 |
| 3.22 | *Кампанент ВНУ* | 440 | 256 |
| 3.23 | *Дысцыпліны і курсы на выбар студэнта* | 220 | 132 |

На базе тыпавых ФІДК распрацаваны вучэбныя планы па кожнаму з пяці напрамкаў спецыяльнасці, якія ўзгоднены з Упраўленнем вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і зацверджаны рэктарам універсітэта.

Упершыню ў адукацыйны стандарт былі ўведзены заліковыя адзінкі (крэдэты). Заліковая адзінка – мера колькаснага вымярэння вучэбнай нагрузкі студэнта па авалоданні вучэбным прадметам, якая ўключае аўдыторныя гадзіны і пазааўдыторную самастойную работу, у тым ліку падрыхтоўку і здачу экзамена. У выніку навучання па спецыяльнасці кожны студэнт за чатыры гады павінен набраць 331 заліковую адзінку. Колькасць гадзін на самастойную работу па кожнай дысцыпліне ў залежнасці ад яе «прафесійнай вагі» разлічвалася з дапамогай каэфіцыента ад 1,3 да 1,9 да колькасці аўдыторных гадзін.

Выкладчыкі факультэта актыўна распрацоўваюць вучэбна-метадычную дакументацыю для забеспячэння выкладаемых дысцыплін у адпаведнасці з новым адукацыйным стандартам. Своечасова выдаюцца тыпавыя вучэбныя праграмы. У электроннай бібліятэцы універсітэта размешчаны вучэбна-метадычныя комплексы па кожнай дысцыпліне з магчымасцю іх анлайнавага выкарыстання. Яны ўключаюць тыпавыя (вучэбныя) праграмы; тэксты лекцый, планы семінарскіх заняткаў, методыку выканання практычных і лабараторных работ, заданні па самастойнай рабоце студэнта, формы і графікі яе кантролю, тэсты, аўдыёвізуальныя матэрыялы і інш.

Толькі за апошнія тры гады былі выдадзены наступныя вучэбныя, вучэбна-метадычныя і навукова-практычныя дапаможнікі для студэнтаў: «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» (Л.А. Дзямешка, С.А. Паўлава) «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» (С.В. Зыгмантовіч), «Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне» (Н.А. Ляйко, А.І. Фядорына), «Гісторыя беларускай бібліяграфіі», «Гісторыя краязнаўства Беларусі» (В.І. Саітава), «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк Беларусі» (Ю.А. Галкоўская), «Менеджмент школьных библиотек» (Л.А. Дзямешка), «Уводзіны ў спецыяльнасць» (С.А. Паўлава), «Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк» (Ю.А. Пераверзева), «Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага і медыцынскага комплексу» (Р.А. Ровіна, В.А. Касап), «Формирование кадровых ресурсов библиотек в новой информационной среде» (І.Б. Стралкова), «Математико-статистические методы анализа в библиотечно-информационной деятельности» (В.В. Нешытой), «Национальная библиотека Беларуси» (Р.С. Матульскі) і інш.

На факультэце актыўна ўкараняюцца інавацыйныя метады і формы выкладання дысцыплін: лекцыі-прэзентацыі, лекцыі-дыялогі; распрацоўка і абарона праектаў; мадэліраванне вытворчых сітуацый; спецсемінары; семінары ў форме «круглых сталоў»; электронныя семінары; відэазапісы вучэбных заняткаў; электронныя модулі навучання на базе інтэграванай сістэмы распрацоўкі і суправаджэння дысцыплін (ICPICK Moodle 1,9); анлайнавыя сродкі стварэння веб-старонак (Google Pages, Picasa); рэйтынгавая сістэма кантролю за вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў. Для забеспячэння дыстанцыйнай самастойнай работы

па шэрагу дысцыплін падтрымліваюцца веб-сайты, на якіх прадстаўлены ўсе метадычныя матэрыялы і прадугледжана зваротная сувязь са студэнтамі ў анлайнавым рэжыме (e-mail, ICQ).

ФІДК трывала займае ў БДУ культуры і мастацтваў па выніках работы за год першыя-другія месцы па навукова-даследчай рабоце, але, на жаль, па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», нягледзячы на вялікую колькасць публікацый, за апошнія пяць гадоў не выдадзена ніводнай манаграфіі.

Забяспечыць якасць адукацыйнага працэсу немагчыма без адпаведных матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, неабходных для правядзення практычных, лабараторных і навукова-даследчых работ студэнтаў, якія прадугледжаны вучэбным планам. На ФІДК функцыянуюць камп'ютэрныя лабараторыі, якія разам з кафедрамі і дэканатам падключаны да карпаратыўнай камп'ютэрнай сеткі універсітэта; парк ПЭВМ за апошнія гады значна пашырыўся. Набыта неабходнае праграмнае забеспячэнне. Усе студэнты вывучаюць і набываюць навыкі работы ў асяроддзі сучасных АБІС «MARC-SQL», «ALIS», «ІРБІС 64». Акрамя таго, падчас вытворчай практыкі яны працуюць і ў іншых АБІС, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэках. Для ажыццяўлення самастойнай работы студэнтаў, напісання курсавых і дыпломных работ актыўна выкарыстоўваецца інфармацыйны цэнтр універсітэта. Праграмна-тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу патрабуе пастаяннага абнаўлення і нарошчвання.

Факультэт актыўна ўзаемадзейнічае з буйнейшымі бібліятэкамі краіны. Створаны вучэбна-навукова-вытворчыя комплексы з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Мінскай абласной бібліятэкай імя А.С. Пушкіна, Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкай, Цэнтралізаванай сістэмай дзіцячых бібліятэк г. Мінска, Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэкай. Плануецца заключыць адпаведныя дамовы і з іншымі бібліятэкамі і інфармацыйнымі цэнтрамі.

Да працы на факультэце актыўна далучаюцца вядомыя спецыялісты ў галіне інфармацыйна-дакументных камунікацый: дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ), доктар педагагічных навук, прафесар Р.С. Матульскі; намеснік дырэктара НББ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Т.В. Кузьмініч; намеснік дырэктара НББ, кандыдат педагагічных навук А.Е. Далгаполава; загадчык аддзела НББ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт А.В. Прадзеіна; дырэктар Нацыянальнай кніжнай палаты А.В. Іванова; вядучыя спецыялісты ў галіне аўтаматызацыі бібліятэчнай справы.

Апошнім часам ФІДК пачаў працу па ўкараненню сістэмы менеджменту якасці паводле патрабаванняў стандарта ISO 9001, якая грунтуецца на 8-мі асноўных прынцыпах: арыентацыя на спажыўца адукацыйных паслуг; лідэрства кіраўніка; далучэнне персаналу; працэсны падыход; сістэмны падыход да менеджменту; пастаяннае паляпшэнне; прыняцце рашэнняў, заснаваных на фактах; узаемавыгадныя адносіны з партнёрамі, работадаўцамі і іншымі пастаўшчыкамі на рынку адукацыйных паслуг. Укараненню сістэмы менеджменту якасці спрыяе рэйтынгавая сістэма ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў факультэта, якая актывізуе іх навучанне і імкненне да лідэрства, а таксама сістэма атэстацыі прафесарска-выкладчыцкага складу.

Другой ступенню вышэйшай бібліятэчнай адукацыі з'яўляецца магістратура. Пасля яе заканчэння прысвойваецца кваліфікацыя «магістр педагагічных навук». Пры паступленні ў магістратуру абавязковай з'яўляецца наяўнасць здольнасці да навуковай дзейнасці, друкаваных прац і рэкамендацыя Савета ФІДК (для тых, хто паступае ў год заканчэння універсітэта). Падчас навучання ў магістратуры здаюцца кандыдацкія экзамены па філасофіі і замежнай мове, а таксама абараняецца магістарская дысертацыя. Конкурс пры паступленні ў магістратуру, на жаль, застаецца малым – у сярэднім 1,5 чалавек на месца. Пакуль на дзяржаўным узроўні не вызначаны і сацыяльны статус магістра, тыя пасады, якія ён можа прыярытэтна займаць. Але справа кожнай бібліятэкі, як гэта робіцца, напрыклад, у НББ, падтрымаць выпускніка магістратуры ў кар'ерным росце з адпаведнымі фінансавымі наступствамі.

Выпускнікі магістратуры, мэтанакіраваныя на навукова-педагагічную дзейнасць, паступаюць у аспірантуру. Вышэйшая атэстацыйная камісія Рэспублікі Беларусь значна павялічыла патрабаванні для суіскальнікаў аспірантуры. Цяпер для тых, хто паступае ў аспірантуру педагагічнага напрамку (у тым ліку і па навуковай спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства»), неабходна мець, акрамя ўсяго астатняга, папярэдні двухгадовы стаж работы па спецыяльнасці. Таму некаторыя выпускнікі магістратуры не могуць адразу патрапіць у аспірантуру. Папрацаваўшы ў бібліятэках, многія з іх ужо не звязваюць сваю будучыню з навуковай дзейнасцю. Па азначаных і іншых прычынах апошнія два гады спецыяльныя кафедры факультэта не выконваюць план набору ў аспірантуру па дзённай форме навучання. Многія выпускнікі дзённай аспірантуры на працягу пяці і больш гадоў не могуць абараніць кандыдацкія дысертацыі. За апошнія пяць гадоў у навуковым спецыялізаваным савеце універсітэта было абаронена толькі 4 кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства» (Л.І. Доўнар, Н.Я. Петушко, А.Е. Далгаполава, І.Б. Стралкова). Разам з тым, існуе неабходнасць значнага амаладжэння навукова-педагагічнага складу кафедраў факультэта, маладыя навукоўцы патрэбны ў бібліятэчным каледжы, буйнейшых бібліятэках краіны.

Кароткі агляд стану падрыхтоўкі навуковых кадраў у сферы бібліятэчнай справы сведчыць, што ў БДУ культуры і мастацтваў створаны і паспяхова дзейнічаюць усе яе элементы: магістратура, аспірантура, дактарантура, працуе савет па абароне кандыдацкіх дысертацый. Але на працягу апошніх гадоў адсутнічае ўстойлівы конкурс у магістратуру і аспірантуру, не наладжана мэтавая падрыхтоўка аспірантаў з боку навуковых бібліятэк, бібліятэк рэгіянальных універсітэтаў і каледжаў краіны.

У БДУ культуры і мастацтваў існуе магчымасць павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў, а таксама атрымання дадатковай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» з атрыманнем кваліфікацыі «бібліятэкар-бібліёграф» і дыплома дзяржаўнага ўзору. За апошнія пяць гадоў у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (ІПКіП) універсітэта звыш 40 чалавек атрымалі бібліятэчную адукацыю на базе першай вышэйшай. ФІДК забяспечвае ІПКіП навукова-педагагічнымі кадрамі і неабходным вучэбна-метадычным аснашчэннем.

Падрыхтоўка сучаснага бібліятэчнага спецыяліста з вышэйшай адукацыяй немагчыма без эфектыўнай сістэмы выхаваўчай работы. У гэтым напрамку дзейнасці

## Да Года роднай зямлі

ФІДК займае першыя пазіцыі ва універсітэце. Студэнты факультэта пастаянна атрымоўваюць прэзідэнцкія стыпендыі, стыпендыі імя Ф. Скарыны, М. Багдановіча, Савета універсітэта. Значная колькасць студэнтаў з'яўляецца лаўрэатамі Рэспубліканскага конкурсу навуковых студэнцкіх работ, лаўрэатамі конкурсу-фестывалю аматарскай мастацкай творчасці «Сем муз» у самых разнастайных намінацыях, пераможцамі спартыўных спаборніцтваў. Факультэт з'яўляецца заснавальнікам дзвюх універсітэцкіх грамадскіх студэнцкіх арганізацый: культурна-асветніцкага таварыства «ЭТНА», вядомага па ўсёй Беларусі сваімі акцыямі па захаванні культурна-гістарычнай спадчыны; творчага аб'яднання «БУКет», у склад якога ўваходзяць маладыя паэты і празаікі універсітэта; з 2001 г. выйшлі з друку сем зборнікаў вершаў і прозы студэнтаў і выкладчыкаў.

Факультэт ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва з профільнымі факультэтамі і інстытутамі універсітэтаў Еўропы: Вышэйшай школай тэхнікі, эканомікі і культуры (г. Дрэздэн, ФРГ), Варшаўскім, Вроцлаўскім і Люблінскім універсітэтамі Польшчы, Вільнюскім універсітэтам Літвы, Маскоўскім, Санкт-Пецярбургскім, Казанскім, Кемераўскім універсітэтамі культуры і мастацтваў Расіі, Харкаўскай акадэміяй культуры Украіны. У якасці выкладчыкаў на факультэце працавалі і выступалі з лекцыямі прафесары з ЗША, Германіі, Францыі, Польшчы, Літвы, Расіі, Украіны. Выкладчыкі факультэта праходзілі азнаямляльныя стажыроўкі ў буйнейшых бібліятэках і універсітэтах ЗША, Францыі, Германіі, Швецыі, Нарвегіі, Даніі, Польшчы, Чэхіі, Італіі, Літвы, Расіі і іншых краін.

Мы па праву ганарымся сваімі выпускнікамі, усімі тымі, хто плённа і рупліва працуе ў бібліятэках – ад невялічкай сельскай да нацыянальнай – і ўносіць свой непасрэдны ўклад у развіццё бібліятэчнай справы і культуры Беларусі.

З 65-годдзем цябе, родны факультэт!

**Літаратура**


1. **Лявончыкаў, В.** Факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры – 55 гадоў / В. Лявончыкаў, Р. Ровіна, Р. Матульскі // Бібліятэчны свет.– 2000.– № 2.– С. 5–7.

2. **Крокі** ў будучыню : інтэрв'ю з дэканам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый М.А. Яцэвічам / Правялі: Л. Кірухіна і члены навуковага студэнцкага аб'яднання «Бібліяном» А. Астапчык, К. Лобан, С. Майсейшын і інш. // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 2. – С. 26–30.

3. **Грыгаровіч, Я.Д.** Флагман інфармацыйнай сферы : да 60-годдзя факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры / Я.Д. Грыгаровіч // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 3. – С. 3–4.

4. **Зыгмантовіч, С.** Кафедры як асноўныя структурныя падраздзяленні ФІДК / С. Зыгмантовіч, В. Лявончыкаў, А. Марозаў, В. Гуліцкая, А. Грыцкевіч, Н. Падабедава // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 3. – С. 6–10.

5. **Яцэвіч, М.** Гістарычныя вехі развіцця ФІДК // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 3. – С. 4–6.



**Summary**

M. Jatsevich introduces the basic directions of the development of higher library education in the country, the changes that have occurred in this area over the past five years, innovative forms and methods concerning library courses teaching, as well as research activities at the Information and Communication Department of Belarusian State University of Culture and Arts.